МЁРТВЫЯ І ЖЫВЫЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Што наогул падштурхнула вас заняцца гэтай дзейнасцю? — пацікавіліся мы ў Мікалая Сяргеевіча.

— Вайна не абмінула ніводнай беларускай сям'і, мая таксама не была выключэннем. З васьмі братоў дзеда на вайне ацалелі ўсяго двое. І толькі аб адным з загінулых атрымалася знайсці звесткі. За свой апошні бой ён пасмяротна быў узнагароджаны медалём «За адвагу». Першая ў маім жыцці Вахта памяці праходзіла каля вёскі Шапялевічы Круглянскага раёна. У 1944-м савецкі дэсант крыху не разлічыў прызямленне і трапіў проста ў цэнтр нямецкай калоны. Мы знаходзілі ў колішніх акопах астанкі нямецкіх і савецкіх салдат, якія так і ляжалі побач, нават не разамкнуўшы рукі ў апошняй сваёй смяротнай сутычцы. За 11 дзён паднялі астанкі 13 нямецкіх і 60 савецкіх салдат.

— У зніклых без звестак няма нават даты смерці. І для іх родных у любым калене гэта трагедыя. Большасць запытаў з просьбай адшукаць сваякоў паступае на сайт пошукавага атрада «Віккру» цяпер менавіта ад унукаў і праўнукаў невядомых салдат. Да нас звяртаюцца грамадзяне Беларусі, Расіі, Украіны, Германіі, Латвіі, ЗША, Ізраіля. За год мы атрымліваем некалькі сотняў такіх лістоў.

Пошукавая работа — гэта наш пярэдні край барацьбы за савецкіх салдат, за забітых мірных жыхароў, за захаванне сапраўднай гісторыі вайны. Сіла — у праўдзе, а праўда — у архіўных дакументах і палявых даследаваннях! Нельга, каб той магутны гісторыка-патрыятычны патэнцыял, які неслі ўдзельнікі і ветэраны вайны, зараз

растварыўся і знік. І тут не павінна быць фармалізму. Байцам нашага атрада не трэба тлумачыць, чаму так важна знайсці кожнага байца. Маладым людзям, якія прывыклі да «стралялак» у інтэрнэце, было б карысна пабываць з намі на месцах крывавых бітваў Вялікай Айчыннай. Убачыць узаранае поле з раскінутымі па ім чалавечымі касцямі. Магчыма, нешта б перамянілася ў іх душы.

— Чаго сёння не хапае для развіцця больш маштабнага пошукавага руху ў краіне?

— Не хапае нарматыўнай базы, якая б прадугледжвала стварэнне сектараў пошукавай работы пры абласных цэнтрах творчасці і каардынавала б іх дзейнасць, не хапае фінансавання, юрыдычнай самастойнасці і шмат чаго іншага. Сёлета мы накіравалі свой зварот у Акадэмію навук Беларусі з просьбай уключыць нашы прапановы ў праект нарматыўнай базы, якая датычыцца дзейнасці пошукавых арганізацый.

Мы шмат гаворым пра патрыятызм, а пошукавая дзейнасць якраз і выхоўвае ў чалавеку патрыёта. Па даных на 2018 год, толькі на тэрыторыі Магілёўскай вобласці ў брацкіх воінскіх пахаваннях і адзіночных магілах спачывае больш за 325 тысяч чалавек, з іх вядомыя імёны толькі каля 75 тысяч воінаў, астатнія 250 тысяч — безыменныя! І гэта толькі ўлічаныя пахаванні. Дзясяткі тысяч не пахаваных афіцыйна салдат і камандзіраў Чырвонай Арміі працягваюць заставацца ў акопах, траншэях, лясных ямах, балотах. Дагэтуль невядомы імёны і месцы гібелі членаў лётных экіпажаў, якія не вярнуліся з баявога задання. Для нас справа гонару аднавіць іх, аддаць ім апошнюю пашану. І вельмі маглі б дапамагчы гэтай справе сектары пошукавай работы, пра якія мы сёння так марым. Сумесна з упраўленнем па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў пры Міністэрстве абароны Рэспублікі Беларусь і 52-м асобным пошукавым батальёнам яны б займаліся зборам інфармацыі пра невядомыя падзеі ў гады вайны, даследчай і аналітычнай працай, правядзеннем летніх пошукавых лагераў, разведвальных пошукавых экспедыцый па месцах былых баёў, стварэннем куткоў і музеяў пошукавай работы, вядзеннем банка даных аб нававыяўленых невядомых раней пахаваннях воінаў Чырвонай Арміі. Такая праца цяпер актыўна праводзіцца ў Расіі, падтрымліваецца на самым высокім дзяржаўным узроўні і фінансуецца з федэральнага бюджэту.

— Сёлета вашаму пошукаваму аб'яднанню спаўняецца 25 гадоў. Самы час падсумаваць, што зроблена і што яшчэ трэба зрабіць.

— Падчас нашых сумесных з 52-м асобным пошукавым батальёнам Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь экспедыцый паднятыя і ўрачыста перапахаваныя болей чым 1150 салдат і камандзіраў Чырвонай Арміі, 76 з іх вернутыя імёны. Акрамя гэтага, па архіўных матэрыялах устаноўлена болей чым 20 тысяч імёнаў абаронцаў Магілёўшчыны, якія лічыліся зніклымі без звестак.

Па ініцыятыве «віккраўцаў» тры вуліцы Магілёва названы імёнамі герояў абароны — Рыгора Златавустаўскага, Мікалая Цярохіна і Якава Слепакурава. У Чавускім раёне ўстаноўлены першы ў краіне помнік штрафным батальёнам Чырвонай Арміі, якія на працягу некалькіх месяцаў 1943-га штурмавалі на Проні нямецкія пазіцыі.

Наперадзе ў нас яшчэ вельмі шмат работы. Наспела неабходнасць узвядзення годнага мемарыяла ў Чавускім раёне. Тут, на рацэ Проня па лініі Дуброўна — Слаўгарад (Прапойск), у 1943—1944 гадах на працягу паўгода дзясяткі дывізій Заходняга фронту вялі цяжкія кровапралітныя баі. За гэты час яны страцілі больш чым 330 тысяч чалавек — забітымі, параненымі, зніклымі без вестак. І мы павінны аддаць ім даніну павагі.

У планах таксама стварэнне навукова-папулярных кніг аб дзейнасці ў гады Вялікай Айчыннай вайны вайсковых дыверсійных разведгруп на тэрыторыі вобласці, партызанскага друку ў Клічаўскай партызанскай зоне. Строім планы наконт наступных Вахтаў памяці. Архіўныя дакументы і нямецкія аэрафотаздымкі дапамогуць нам вызначыцца з месцамі пошукаў. Спадзяёмся, што ў выніку нашых экспедыцый белых плям у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны стане яшчэ менш. За апошнія шэсць гадоў клубам былі ўстаноўлены месцы падзення ў гады вайны савецкіх самалётаў: пікіруючага бамбардзіроўшчыка Пе-2 у Магілёўскім раёне і далёкага бамбардзіроўшчыка Іл-4 у Клічаўскім. Па нумарных дэталях рухавікоў пры дапамозе расійскіх і ўкраінскіх пошукавікаў устаноўлены імёны экіпажаў і баявыя гісторыі самалётаў. На магіле лётчыкаў у вёсцы Макаранцы Магілёўскага раёна ўстаноўлены помнік, а ў Клічаве, на пахаванні борт-стралка і стралка-радыста, — памятны знак. На жалобнай урачыстай цырымоніі перапахавання прысутнічалі сваякі загінулых з Масквы і Ташкента. Зараз спрабуем устанавіць экіпаж савецкага знішчальніка Ла-5 у Чавускім, бамбардзіроўшчыка Як-4 у Быхаўскім і трох ТБ-2 у Кіраўскім раёнах, якія былі збіты немцамі на працягу 1941—1944 гадоў. Адным словам, работы столькі, што хопіць яшчэ на некалькі пакаленняў наперад.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Фінансы

Карта асноўных задач Нацбанка прадугледжвае інфляцыю сёлета да 5 %

Дакументам стратэгічнага планавання, у якім пазначаны асноўныя мэты і задачы Нацыянальнага банка як інстытута на бягучы год, з'яўляецца Карта асноўных задач фінансавага рэгулятара на год.

Задачы двух узроўняў нацэлены на дасягненне Нацыянальным банкам асноўных мэт па падтрыманні цэнавай і забеспячэнні фінансавай стабільнасці ў 2019 годзе. Да задач першага ўзроўню ставіцца павышэнне інстытуцыйнай эфектыўнасці Нацбанка і падтрыманне інфляцыі, вымеранай індэксам спажывецкіх цэн, у межах 5 %. Задачамі першага ўзроўню стане гарантаванне надзейнага і бяспечнага функцыянавання банкаў, нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый, ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь», а таксама абмежаванне сістэмных рызык фінансавай стабільнасці.

Да другога ўзроўню адносяцца такія задачы, як абарона правоў спажыўцоў фінансавых паслуг і прыняцце мер, якія спрыяюць дэдаларызацыі эканомікі. Таксама важнае забеспячэнне кантролю над ростам грашовага прапанавання, дастатковага для задавальнення плацежаздольнага попыту эканомікі на грошы. У задачах другога ўзроўню знайшлі адлюстраванне і пытанні развіцця фінансавага рынку ў разрэзе яго сегментаў, інстытутаў і інструментаў. Такі падыход заснаваны на фундаментальным уздзеянні цэнавай і фінансавай стабільнасці на ашчадныя і інвестыцыйныя матывы паводзін суб'ектаў гаспадарання і насельніцтва, што вызначае дзелавы клімат у эканоміцы і перспектывы развіцця фінансавага рынку.

Сяргей КУРКАЧ.

...ЗМЕНІЦЦА Ў КАПРАМОНЦЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прадугледжаны таксама перавод пячнога ці газавага індывідуальнага ацяплення або гарачага водазабеспячэння на электрычнае, а таксама ўладкаванне і рамонт сістэм дымавыдалення.

— Гэта звязана з тым, што існуюць пытанні пры ацяпленні і гарачым водазабеспячэнні ад індывідуальных газавых калонак і печаў, — растлумачыў **Андрэй РАМАШКА, начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства ЖКГ.** — Неабходнасць пераводу сістэмы ацяплення з аднаго віду ў другі павінны планаваць мясцовыя органы. У межах правядзення капрамонту ім даручана ўключыць жылыя дамы, дзе патрабуецца замена, у графікі і тытульныя спісы.

На ацяпляльных прыборах у кватэрах мажліва ўстанаўліваць тэрмарэгулятары. Дыстанцыйнае здыманне паказчыкаў з іх скіравана на паляпшэнне якасці аказання жыллёва-камунальных паслуг (ЖКП) і забеспячэнне максімальнай зручнасці пры арганізацыі разлікаў за ўжытыя паслугі. Не трэба будзе падаваць у разлікова-даведачныя цэнтры лічбы з прыбораў уліку. А пакватэрны ўлік цеплаэнергіі праз сістэмы рэгулявання дазволіць людзям самастойна кантраляваць колькасць спажытага цяпла і разлічвацца выключна за яе, дадаў прадстаўнік ЖКГ:

— Мы павінны даць спажыўцу магчымасць займацца пытаннямі рэгулявання. Разлічвацца па прыборах ці не — яго асабістае рашэнне. Аднак, як паказвае практыка, дамы, дзе займаюцца хаця б агульным рэгуляваннем цепласпажывання, скарачаюць яго аб'ёмы прыкладна на 12 %. Рэгуляванне дазволіць таксама пазбегнуць перагрэву ў памяшканнях. Гэта мерапрыемства на перспектыву.

Таварыствы ўласнікаў і цеплавая мадэрнізацыя

Уводзіцца ў эксплуатацыю адрамантаваныя будынкі будуць пасля выканання ўсяго комплексу работ, а не асобных яго частак, што дазволіць пазбавіцца нараканняў на недаробкі. Уласнікі жылля змогуць фактычна самастойна прымаць рашэнні адносна работ планаванага капрамонту дома, бо агульны сход мае адбывацца яшчэ на стадыі праектавання, а не напярэдадні пачатку работ.

— Здараецца, што ў доме нешта недаабследавалі, да кагосьці не дайшлі. Адпаведна, пэўныя работы выпадаюць з праекта, які ўжо гатовы. Трэба, каб у праектна-каштарысную дакументацыю ўвайшлі работы, якія непасрэдна звязаны з унутранай часткай жылых памяшканняў. Каб дайшлі да кожнага, прычым з удзелам спажыўцоў, — заўважыў Андрэй Рамашка.

У пастанове № 39 улічана таксама планаваная ў краіне цеплавая мадэрнізацыя, якая ў далейшым дазволіць падчас капрамонту (з улікам пажаданняў уласнікаў) правесці мадэрнізацыю на пэўных умовах: з удзелам дзяржавы, растэрміноўкай і г. д.

Пры вызначэнні аб'ёмаў цеплавой мадэрнізацыі будзе прапанавана некалькі варыянтаў адпаведна эфекту і кошту, які выберуць самі ўласнікі.

Таварыствы ўласнікаў цяпер таксама могуць далучыцца да капрамонту ў межах дзяржпраграмы, дадаў спецыяліст:

— Устаноўлены дакладны механізм разліку сродкаў, неабходных пры правядзенні капрамонту, якія таварыствы ўласнікаў (ТУ) ці арганізацыі-забудоўшчыкі павінны былі акумуляваць на сваім рахунку або пераводзіць на рахунак мясцовага бюджэту. Да гэтага, калі падчас усяго перыяду эксплуатацыі будынку ці толькі пэўны тэрмін грошы на рахунак бюджэту не ўносіліся, ТУ фактычна не мелі права ўдзельнічаць у агульнадзяржаўнай праграме капрамонту. Цяпер пасля ўнясення адпаведнай сумы адлічэнняў яны могуць далучыцца да дзяржпраграмы.

Пры ўсіх новаўвядзеннях тарыфы адлічэнняў на капрамонт для людзей будуць узрастаць толькі ў межах павелічэння ўсяго комплексу жыллёва-камунальных паслуг штогод, што абумоўлена Указам № 550. Цяпер насельніцтва аплачвае прыкладна трэць кошту капрамонту.

Ірына СІДАРОК.